паказвае, што тут збіраюцца побач з рэдкай і каштоўнай кнігай кнігазнаўчая літаратура, творы па гісторыі беларускай і замежнай кнігі. Робяцца спробы наладзіць па магчымасці не толькі экскурсіі студэнтаў, але і больш актыўныя кантакты з адпаведным аддзелам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама з іншымі бібліятэкамі, якія маюць гістарычныя кніжныя фонды, з выдавецтвамі.

Важнай праблемай з'яўляецца стварэнне фонду нагляднасці. Матэрыял курса дае шырокія магчымасці для выкарыстання натуральных, аб'емных, вобразных і графічных яе сродкаў. За мінулы год часткова яны створаны і выкарыстоўваюцца. На занятках дэманструюцца канкрэтныя выданні і іх элементы, праглядаюцца фільмы «Як ствараецца кніга» і «Кніжная графіка». Па тэмах, звязаных з узнікненнем пісьменнасці, сучасным станам развіцця кнігавыдавецкай справы, маюцца схемы, табліцы, дыяграмы. Распрацоўваюцца найбольш эфектыўныя наглядныя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца з дапамогай тэхнічных сродкаў. Плануюцца заняткі, тэмы рэфератаў, курсавых работ, што арыентуюць студэнтаў на стварэнне наглядных матэрыялаў.

Усе гэта патрабуе не толькі сіл, сродкаў, але і часу, а пакуль у кіна - і відэатэках універсітэта адсутнічаюць стужкі пра дзеячаў кніжнай справы ў Беларусі, іншых краінах, няма іншых цэнтралізавана створаных раней матэрыялаў, у спецыяльным кабінеце не захавана ніякай нагляднасці, шмат недахопаў у камплектаванні кніжнага фонду па гісторыі кнігі.

Акуліч У.А.,
дацэнт

## АЛГАРЫТМ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА «БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫ МАРКЕТЫНГ»

1. У сувязі з пераходам Рэспублікі Беларусь да рыначных адносін узнікае патрэбнасць у маркетынгу. Маркетынг неабходны тады, калі трэба дзейнічаць ва ўмовах канкурэнтнай барацьбы, калі галоўным крытэрыем дзейнасці з'яўляецца рэальны збыт тавараў і паслуг.

2. Інфармацыйная індустрыя - гэта частка сучаснай грамадскай вытворчасці, маючай выхад на рынак з інфармацыйнымі паслугамі. Інфармацыйная індустрыя сфарміравалася ў свеце ў апошняе дзесяцігоддзе, а ў нашай рэспубліцы толькі пачала фарміравацца. Мы лічым, што гэта вельмі перспектыўны накірунак, таму што ў свеце па прыбытках у бізнесе ён стаіць на другім месцы, уступае толькі продажу антыкварыяту і твораў мастацтва.

3. Інфармацыйная індустрыя можа вывучацца студэнтамі факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм і каледжа па спецыяльнасці «мэнеджмэнт інфармацыі ў бізнесе і бібліятэчнай справе». Гэта новы сегмент рынку, дзе яны змогуць з добрай выгадай для сябе паказаць, на што здольныя.

4. Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг - гэта аснова інфармацыйнай індустрыі. Ён патрабуе вывучэння інфармацыйных патрабаванняў грамадства і асобы і іх задавальнення. І таму на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм яму павінна быць адведзена дастойнае месца.

5. Алгарытм вывучэння курса «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг» складаецца з наступных элементаў: а) лекцыя, матэрыял якой павінен ўвесці студэнтаў у праблему, у ёй таксама паведамляецца аб новым і важным па абранай праблеме, намячаюцца шляхі самастойнага вывучання прадмета; б) самастойная работа студэнтаў, яна ідзе па двух напрамках: авалоданне класічным маркетынгам па кнізе Ф.Котлера «Асновы маркетынгу»; вывучэнне выданняў і артыкулаў па бібліятэчна-інфармацыйнаму накірунку з дапамогай аналітычных рэфератаў; в) семінарскія заняткі, якія садзейнічаюць развіццю студэнцкай думкі ў неабходным напрамку, гэтыя заняткі праводзяцца ў форме дзелавых і сітуацыйных гульняў; г) кантрольныя работы, з іх дапамогай ажыццяўляецца праверка ведаў студэнтаў, яны выконваюць ролю маста адваротнай сувязі паміж студэнтамі і выкладчыкам; д) маркетынгавае даследаванне, яно дае канкрэтныя практычныя навыкі па выкананні даследаванняў і замацаванні тэарэтычных ведаў; е) экзамен, ён улічвае ўсю працу студэнтаў па гэтаму курсу. І калі студэнтам штонебудзь не выканана, да экзамена ён не дапускаецца.

Каб удасканаліць гэты курс, мы мяркуем метадычную дакументацыю зрабіць па наступных напрамках.

1. Назва тэмы курса

2. N тыдня, калі будзе вывучацца пэўная тэма

3. Арганізацыйныя формы адукацыі

3.1. Лекцыя

3.2. Змест задання па самастойнай рабоце студэнта

3.2.1. Колькасць лістоў для вывучэння

3.2.2. Неабходная колькасць часу для работы над імі

3.3. Тэма семінарскіх заняткаў

3.3.1. Колькасць лістоў рэкамендаванай літаратуры

3.3.2. Колькасць часу, неабходнага для іх вывучэння

3.4. Тэма практычных заняткаў

4. Кантроль за працай студэнтаў

4.1. Формы бягучага кантролю
4.2. Формы памежавага кантролю
4.3. Форма тэматычнага кантролю
4.4. Форма падагульняючага кантролю
5. Інтэнсіфікацыя адукацыі
5.1. Дзелавыя гульні
5.2. Праблемная адукацыя
5.3. Нагляднасць у адукацыі
5.4. Тэхнічныя сродкі і ЭВМ
6. Забеспячэнне матэрыяламі
6.1. У вучэбным кабінеце
6.2. У бібліятэцы універсітэта
6.3. У бібліятэках горада
7. Выкарыстанне ВДРС і НДРС

Усе гэта, на наш погляд, аблегчыць студэнтам засваенне курса.

Ляйко Н.А.,
дацэнт

## ПРАБЛЕМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ»

У наш час вялікае значэнне мае фарміраванне ўсебакова падрыхтаванага чалавека. Вялікая роля ў гэтым належыць кнізе, бібліятэцы. Пры гэтым асаблівай увагі патрабуюць бібліятэкі, якія абслугоўваюць дзяцей. Навучыць школьнікаў карыстацца кніжнымі багаццямі, арыентавацца ў патоку інфармацыі і своечасова папаўняць свае веды можна толькі тады, калі фонд бібліятэкі і яе даведачны апарат добра арганізаваны. Расстаноўка кніжных фондаў і іх усебаковае адлюстраванне ў сістэматычным каталогу залежаць ад якасці табліц класіфікацыі і ўмення бібліятэчных работнікаў кваліфікавана карыстацца імі.

У курсе «Сістэматызацыя дзіцячай літаратуры» студэнты не толькі вывучаюць структуру табліц ББК для дзіцячых і школьных бібліятэк, але і вучацца ўдасканальваць табліцы, дапрацоўваць іх. Ужо трэці год гэты курс выкладаецца на беларускай мове. Трэба адзначыць, што студэнты добра ёю валодаюць. Але ёсць іншыя праблемы: няма сучасных падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў. Змены, якія адбываюцца ў грамадстве, дасягненні ў галіне навукі і тэхнікі не знайшлі адлюстравання не толькі ў вучэбнай літаратуры, але і ў табліцах класіфікацыі, якімі карыстаюцца для сістэматызацыі бібліятэчных фондаў. Таму мы ў метадычных указаннях да курса і лекцыях гэта ўлічылі. Яны дапрацаваны з улікам сучасных змен у грамадстве, напоўнены нацыянальным зместам. На занятках вывучаюцца асаблівасці сістэматызацыі дзіцячай літаратуры, арганізацыя і вядзенне каталогаў у дзіцячай і школьнай бібліятэках, што з'яўляецца неад'емнай і важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкара да практычнай дзейнасці.

Значнае месца пры вывучэнні курса надаецца лабараторным заняткам, якія робяць працэс навучання больш жывым і творчым. Асаблівую цікавасць у час практычных заняткаў выклікае аналіз табліц ББК для дзіцячых і школьных бібліятэк. У сувязі са зменамі ў сацыяльна-эканамічным і грамадскім жыцці, з'яўленнем на тэрыторыі былога СССР самастойных суверэнных дзяржаў уносім змены ў табліцы ББК: расфарміроўваем аддзел «1 К.Маркс, Ф.Энгельс, У.І.Ленін. Марксізм-ленінізм», дапрацоўваем аддзелы «6/8 Грамадскія і гуманітарныя навукі», у прыватнасці»65 Эканоміка», «67 Дзяржава і права». Вучым студэнтаў працаваць з занава распрацаванымі аддзеламі «63 Гісторыя», «66 Палітыка», «86 Рэлігія. Атэізм», «87 Філасофія». У аддзеле «63 Гісторыя» намі ўпершыню падрабязна распрацаваны падраздзел «63.3 (4 Беі) Гісторыя Беларусі».

Удасканаленню прафесійнай адукацыі студэнтаў і лепшаму засваенню практычных навыкаў, на наш погляд, садзейнічаюць:

1. Творчыя заданні для практычных заняткаў, выкананне якіх патрабуе ўмення аналізаваць табліцы класіфікацыі і літаратуры, выяўляць супярэчнасці думак розных аўтараў, старых і новых тэорый і поглядаў. Пры гэтым студэнты пастаўлены ў такія ўмовы, калі яны павінны звяртацца да новых дакументаў, метадычных распрацовак, спецыяльных перыядычных выданнях і інш.

2. Пераклад на беларускую мову, дапрацоўка і папаўненне табліцы «Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя: Табл. для дзіц. і шк. б-к/ Ляйко Н.А., Фядорына А.І., Ціманюк С.І. - Мн., 1994 - 92 с.

3. Бягучы і выніковы кантроль, які ўключае не толькі тэарэтычную, але і практычную частку курса.

З мэтай стварэння належных умоў для набыцця прафесійных ведаў і практычных навыкаў рыхтуем да выдання на беларускай мове вучэбны дапаможнік «Сістэматызацыя дзіцячай літаратуры».

Але і гэта не вырашыць усе праблемы. Навучанне павінна быць апераджальным. Перш за ўсё гэта адносіцца да тэхналогіі. Сучасная падрыхтоўка бібліятэкара не можа быць абмежавана традыцыйнай картачнай тэхналогіяй. Патрэбна грунтоўна вывучаць электронны каталог: фарматы, іх фарміраванне, увод бібліяграфічных запісаў, пошук па электроннаму каталогу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ